Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мікалай Дзядок асуджаны на 10 сутак дапоўнена

29.03.2017 **Тэгі**: суды



Мікалай Дзядок

29 сакавіка Мікалай Дзядок выпісаўся са шпіталя і дастаўлены ў Партызанскі РУУС Мінска. Пасля 14.00 над ім павінен адбыцца суд.

Падчас акцыі пратэсту на Дзень Волі былы палітвязень быў гвалтоўна затрыманы і потым дастаўлены з чэрэпна-мазгавой траўмай у шпіталь хуткай дапамогі.

Як паведаміў "Радыё Свабода" бацька Мікалая **Аляксандар Дзядок,** 25 сакавіка яго сына спачатку прывезлі ў Партызанскі РУУС, а пазней - у ЦІП на Акрэсціна. Праз некаторы час высветлілася, што Мікалай Дзядок знаходзіцца ў шпіталі хуткай дапамогі ў хірургічным аддзяленні.

Згодна з медыцынскім заключэннем, Мікалай Дзядок атрымаў закрытую чэрэпна-мазгавую траўму лёгкай ступені, страсенне галаўнога мозгу, параарбітальную гематому злева, удар мяккіх тканяў твару і патыліцы.



Мікалай Дзядок у судзе 29 сакавіка

У 15.20 распачаўся суд над Мікалаем. Яго абвінавачваюць у парушэнні ч.1 арт. 23.34 і арт. 23.4 КаАП РБ. Вядзе працэс суддзя Неўмяржыцкі І.І.

Суддзя не задаволіў хадайніцтва аб вызваленні Дзядка ў сувязі з тым, што прайшло больш за 96 гадзін пасля яго затрымання.

Мікалай Дзядок распавядае, што быў зьбіты ў міліцэйская аўтобусе (білі кулакамі па галаве). У працэсе разгляду справы высветлілася, што сёння (29 сакавіка) на яго быў складзены яшчэ адзін пратакол, у якім пазначана, што Мікалай быў затрыманы сёння ў 12.30 на вуліцы Кіжаватава. Але ў гэты час ён ехаў са шпіталя ў РАУС.

Нягледзячы на разыходжанні ў паказаннях сведак, а таксама на тое, што пратакол аб затрыманні быў складзены праз чатыры дні пасля фактычнага затрымання, Мікалай Дзядок атрымаў 10 сутак арышту.

Твитнуть









Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY